американских социокультурных ценностей, но также создают благоприятные условия для экспорта этих установок в страны-реципиенты.

Концепция глобального мира Pax Americana в современных условиях формирует интернациональную коммуникацию в сфере науки, культуры, образования на английском языке, навязывая странам Третьего мира, не способным конкурировать с гегемоном, унификацию (так называемую, интернационализацию) высшего образования. Цель унификации – это создание глобальной мировой образовательной системы, способной изначально воспитывать у обучаемых восприятие ценностей американского образа жизни.

В период после завершения холодной войны сферы культуры и образования стали важной частью внешнеполитического проекта неоконсерваторов США. Интернационализация системы образования играет роль главного рычага распространения ценностей глобализма Pax Americana в современном мире.

**Библиографический список**

1. Антюхова Е. А. Образование в политике мягкой силы США // Полис. Политические исследования. 2019. № 2. С. 123–136.
2. Блохин К. В. Американский неоконсерватизм и крах Pax Americana. Роль политической элиты в упадке американского могущества. М.: Весь мир, 2021. 224 с.
3. Братерский М. В., Скриба А. С. Концепция «мягкой силы» во внешеполитической стратегии США // Вестник международных организаций. Т. 9. № 2. 2014. С. 130–144.
4. Еремеев С. Г. Образование в современной политической повестке дня // Полис. Политические исследования. 2015. № 1. С. 38–43.
5. Фролова О. А. «Мягкая сила» внешнеполитической деятельности США: институты и механизмы формирования // Вестник РУДН. Сер. Политология. 2013. № 3. С. 49–54.
6. Dearden J. English as a medium of instruction a growing global phenomenon. Oxford: University of Oxford, 2014. 40 p.
7. Wang Y., Li T., Noltemeyer A., Wang A., Zhang J., Shaw K. Cross-cultural Adaptation of International College Students in the United States // Journal of International Students. 2018. Vol. 8. Issue 2. P. 821–842.

# ГІСТОРЫЯ БДУ Ў МАТЭРЫЯЛАХ АРХІЎНЫХ ФОНДАЎ
## (прасапаграфічныя эпізоды мемарыялізацыі сведчанняў інстытуцыяналізацыі інтэлектуальнага супольніцтва Беларусі)

***А. А. Яноўскі*[1], *Н. А. Гантарэнка*[2]**

[1]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, helgoleg@mail.ru*

[2]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці,4, 220030, г. Мінск, Беларусь, gontarenko@bsu.by*

Вызначаны магчымыя навуковыя праблемы і шляхі пошуку неабходнай інфармацыі для даследчыкаў, якія займаюцца вывучэннем гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Акцэнт зроблены на першараднасць архіўных крыніц у развіццё доказнай базы ўжо дастаткова вялікага масіва апублікаваных работ. Падкрэсліваецца важнасць прымянення прасапаграфічнага метаду, звароту да творчых лёсаў соцень вядомых і забытых універсітэцкіх інтэлектуалаў. Праз іх у шматлікіх дэталях і абставінах прасочваецца працэс станаўлення самых розных інстытуцый як самога БДУ, так і рэспублікі. Тым самым у гістарычнай памяці цяперашніх і будучых пакаленняў будуць зафіксаваны і людзі-творцы, і самыя розныя праявы іх інтэлектуальных і фізічных намаганняў. А гісторыя БДУ атрымае ўсебаковае асвятленне, новыя доказы значнасці для беларусаў іх першага ўніверсітэта.

***Ключавыя словы***: Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; архівы; прасапаграфія; інстытуялізацыя; інтэлектуалы; гістарычная памяць.

# ИСТОРИЯ БГУ В МАТЕРИАЛАХ АРХИВНЫХ ФОНДОВ (просопографические эпизоды мемориализации свидетельств институционализации интеллектуального сообщества Беларуси)

***О. А. Яновский*[1], *Н. А. Гонтаренко*[2]**

[1] *Белорусский государственный университет, пр. Независимости,4, 220030, г. Минск, Беларусь, helgoleg@mail.ru*

[2] *Белорусский государственный университет, пр. Независимости,4, 220030, г. Минск, Беларусь, gontarenko@bsu.by*

Определены возможные научные проблемы и пути поиска необходимой информации для исследователей, занимающихся изучением истории Белорусского государственного университета. Акцент сделан на первостепенность архивных источников в развитие доказательной базы уже достаточно большого массива опубликованных работ. Подчеркивается важность применения просопографического метода, обращения к творческим судьбам сотен известных и забытых университетских интеллектуалов. Через них в многих деталях и обстоятельствах прослеживается процесс становления самых различных институций как самого БГУ, так и республики. Тем самым в исторической памяти настоящих и будущих поколений будут зафиксированы и люди-творцы, и самые различные проявления их интеллектуальных и физических усилий. А история БГУ получит всестороннее освещение, новые доказательства значимости для белорусов их первого университета.

***Ключевые слова:*** Белорусский государственный университет; архивы; просопография; институционализация; интеллектуалы; историческая память.

# HISTORY OF BSU IN THE MATERIALS OF ARCHIVAL FOUNDATIONS (prosopographic episodes of the memorialization of testimonies institutionalization of the intellectual community of Belarus)

***O. A. Yanovsky*[1], *N. A. Gontarenko*[2]**

[1] *Belarusian State University, Independence Ave., 4, 220030, Minsk, Belarus, helgoleg@mail.ru*

[2)] *Belarusian State University, Independence Ave., 4, 220030,
Minsk, Belarus, gontarenko@bsu.by*

Identified the possible problems and ways of searching for the necessary information for researchers involved in the study of the history of the Belarusian State University. The emphasis is on the primacy of archival sources in the development of the evidence base for a fairly large array of published works. The importance of applying the prosopographic method along with the addressing of the creative destinies of hundreds of famous and forgotten university intellectuals is emphasized. Through them, in many details and circumstances, the process of formation of various institutions of both the BSU itself and the republic can be traced. Thus, in the historical memory of present and future generations, both people-creators and the most diverse manifestations of their intellectual and physical efforts will be recorded. And the history of BSU will receive comprehensive coverage and the new evidence of the significance of their first university for Belarusians.

***Keywords:*** Belarusian State University; archives; prosopography; institutionalization; intellectuals; historical memory.

Ня сакрэт для любога даследчыка, што толькі «жывы», архіўны матэрыял можа паспрыяць унесці асабісты ўклад у захаванне гістарычнай спадчыны праз адпаведную яго апрацоўку і давядзенне да больш-менш дасведчанай, зацікаўленай аўдыторыі.

Што ж тычыцца гісторыі нашага ўніверсітэта, пад знакам якой мы рэгулярна ладзім розныя навуковыя форумы, то яна за апошнія гады заняла пачэснаае месца сярод навуковых прыярытэтаў сталых і маладых даследчыкаў. Асаблівы штуршок гэтай справе быў нададзены падрыхтоўкай стогадовага юбілею БДУ. Так што на сёняшні дзень маецца даволі аб'ёмісты бібліяграфічны спіс розных па характару адпаведных прац. У дадзеным артыкуле не ставіцца задача зрабіць іх аналіз, хаця і настала пара і для гэтага. У дадзеным выпадку хацелася выказаць некалькі заўваг аб перспектывах далейшай распрацоўкі тэмы «гісторыя БДУ».

Тэма, што вынесена на канферэнцыю, сфармуліравана даволі груваcтка, бо хацелася ў ёй сумясціць некалькі, на наш погляд, важных узаемазвязаных характарыстак-парадыгм, якія патрабуюць навуковага ўдасканальвання. Ад гэтага залежыць далейшае паглыбленне ведаў аб ролі і значэнні першага беларускага ўніверсітэта ва ўсіх праявах гісторыі Беларусі ў цэлым. Па-першае, як адзначана вышэй, толькі спасціжэнне архіўных крыніц можа раскрыць яшчэ многія патаемныя старонкі ўніверсітэцкай гісторыі, зняць міфалагічны флёр з некаторых канстатацый, накопленых за дзесяцігоддзі распрацоўкі праблемы. А гэта, ня сакрэт, часта рабілася ў вялікай спешцы, калі чарговыя юбілейныя даты штурхалі гісторыкаў на падрыхоўку тых ці іншых па навуковай якаснасці тэкстаў. У лепшым выпадку тэксты розных аўтараў пераказвалі адныя і тыя ж сюжэты,

напоўнены не заўсёды выверанымі абагульненнямі, а не крапатлівым выяўленнем прычын і наступстваў велізарнай колькасці праяў універсітэцкай эвалюцыі, мадэрнізацыі, адкатаў ад дасягнутага і прарываў у развіцці. А тым больш мала месца адводзілася паказу Чалавека Універсітэта – яго выдатных навукоўцаў, педагогаў, адміністратараў, нарэшце. І паказу не як застыўшых манументаў, а людзей свайго часу з усімі абставінамі іх узыходжання па «інтэлектуальнай лесвіцы».

Таму, па-другое, выкарыстанне прасапаграфічнага метаду не толькі дазваляе разгледзіць і даследаваць пэўныя эпізоды ўніверсітэцкай гісторыі праз творчасць канкрэтных навукоўцаў, але на гэтай падставе з іх (эпізодаў-біяграфій) больш прадставіць веліч і пэўны трагізм гісторыі і ўсяго БДУ, і гісторыі ўсёй Беларусі. Тым самым, у-трэціх, гэты метад садзейнічае як захаванню памяці (мемарыялізацыі) аб тысячах асоб, так і выяўленню прычын і наступстваў фарміравання самых розных інстытуцый, арганізацыйных форм наладжвання ў Беларусі сістэмы вышэйшай адукацыі, навукі, эвалюцыі вучэбна-навукова-адміністрацыйных структур у самім БДУ. І зноў жа – без уважлівага прачытання тысяч архіўных спраў гэта зрабіць проста немагчыма.

Год таму адзін з аўтараў дадзенага артыкула зрабіў рэмарку ў артыкуле з нагоды стагоддзя БДУ, абазначыўшы перспектывы «асваення» мноства крыніц для стварэння поўнавартаснай гісторыі БДУ [21, с. 77]. Сярод іншага была звернута ўвага на першаснасць за архіўнымі зборамі, аб наяўнасці якіх мы ведаем, але да гэтага часу іх ніхто грунтоўна не распрацоўваў у кантэксце ўніверсітэцкай гісторыі. Пра магчымасці Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ) гаварыць не прыходзіцца, бо ён галоўны пакуль што «пастаўшчык» найкаштоўнай інфармацыі літаральна па ўсіх сюжэтах гісторыі нашага першага беларускага ўніверсітэта. Тым не менш, без перабольшвання, даследчыкі ў яе распрацоўцы знаходзяцца толькі на пачатку шляху. У перспектывах выяўленне самых розных матэрыялаў у фондах, якія на сваёй сутнасці як бы, на першы погляд, мала датычацца праблематыкі БДУ. А якія магчымасці можа даць агульна вядомы той жа 205-ты фонд з яго немалой колькасцю вопісаў, сярод якіх асабліва прываблівае 3-ці вопіс з амаль 10 тысячамі асабістых спраў прафесуры, выкладчыкаў, работнікаў універсітэта. Відавочная каштоўнасць у дачыненні да агульнай гісторыі БДУ пакуль што схаваная ў амаль што 2 тыс. спраў 4-га вопісу гэтага фонду, найцікавы 10-ты вопіс. А былы партыйны фонд (4-ты) увогуле з’яўляецца скарбніцай гісторыі нашай альма матэр.

Адзін з добра «пратораных шляхоў» да дасведчанасці аб людях і інстытуцыях БДУ – гэта Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). Яднанасць (як і відавочная асаблівасць) паміж БДУ і Інбелкультам, а потым БАН (АН БССР) у 1920–1930-я гг. напоўніла адмысловымі матэрыяламі і ўжо згаданы вышэй універсітэцкі 205 фонд НАРБ, і дадзены акадэмічны архіў. Іх матэрыялы – добрая магчымасць і верыфікацыі звестак, і іх узаемадапаўнення. Напрыклад, і там, і там утрымліваецца зусім нешматлікі матэрыял аб працы ў БССР сусветнавядомага матэматыка Я. П. Громера. Да ўсіх іншых цікава дадаецца інфармацыя, у якой сумяшчаецца і інфармацыйны «афіцыёз», і этычныя, шчырыя праяўленні асобы выдатнага вучонага. Калі 23 мая 1932 г. ён падаў заяву з просьбай камандзіраваць яго ў Швейцарыю для ўдзелу ў «Интернациональном математическом конгрессе», то спачатку папрасіў кіраўніцтва БАН прадстаўляць беларускую акадэмію на гэтым сусветным навуковым форуме і прачытаць там даклад аб «о связи теоретической науки с живой практикой в сов. России», а напрыканцы дадаў, што ён едзе праз Берлін «по личным делам», а гэта дасць магчымасць паменшыць расходы на яго камандзіроўку [18, арк. 238–238 зв.].

Матэрыялы, якія захоўваюць Дяржархіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ) і Расійскі дзяржархіў сацыяльна-палітычнай гісторыі (РДАСПГ) і вопісы якіх утрымліваюць мноства спраў, непасрэдна сфарміраваных сотню гадоў таму з матэрыялаў аб прадгісторыі і першапачатковай гісторыі БДУ, беларускаму даследчыку вядомыя толькі з большага. І амаль не распрацаваныя, не ўведзены ў кантэкст размовы аб нашым універсітэце! Там для даследчыкаў работы не на адзін год. Так, у ДАРФ утрымліваецца найцікавы расклад падрыхтоўчых намаганняў, якія беларускія і расійскія вучоныя, работнікі наркаматаў і ведамств рознага ўзроўню прадпрымалі напярэдадні такога лёсавызначальнага рашэння, якое было прынята як бы 25 лютага 1919 г. у Смаленску ЦВК ССРБ. «Як бы» тут азначае, што мы памылкова засведчылі на скрыжалях гісторыі БДУ «круглую» дату – 25 лютага. На сам рэч загадчык Мінскага губана І. С. Савацееў дакладываў «об открытии в Минске Государственного Университета» вечарам 24 лютага. І тады ж было пастаноўлена, што адкрыццё ўніверсітэта не толькі «весьма желательно», але і было вырашана выдзеліць з дзяржказначэйства 1 мільён рублёў. Адпаведны дакумент – выпіска з пратаколу № 24 «Заседания Большого Президиума Ц. И. К Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов от 24-го февраля 1919 года» – знаходзіцца ў фондах гэтага расійскага архіва [5, арк. 8].

У гэтым архіве, напрыклад, утрымліваюцца матэрыялы аб дэталёвай распрацоўцы важнейшых характарыстык будучага «Белорусского Университета», якую яшчэ да рашэння ЦВК ССРБ ажыццявіў выдатны матэматык, уражэнец Магілёўшчыны, на той час дэкан матфакультэта Ніжагародскага ўніверсітэта Іван Раманавіч Брайцаў. У параўнанні з заангажаванасцю ў справе выказвання і агучвання прапазіцый наконт універсітэта ў Мінску імёнаў Я. Ф. Карскага ды М. В. Доўнар-Запольскага гэты вучоны ўзгадваецца амаль што мімаходзь. А тым больш без деталёвага аналізу ягоных вельмі трапных, дэталёвых і рэальных прапаноў, зробленых і па загаду Наркампраса РСФСР, і па вяленню сэрца. Не паглыбляючыся ў іх разгляд, можна толькі здзіўляцца датошнасці ў прапісванні самых дробязей – што і для чаго неабходна набываць, колькі на гэта будзе патрэбна грошай, колькі неабходна наняць вахцёраў, прыбіральшчыц і г. д. І гэта акрамя прывядзення доказаў аб стварэнні пэўных факультэтаў, астранамічнай абсерваторыі, аб штаце і накірунках дзейнасці канцэлярыі ўніверсітэта, яго бухгалтэрыі і г. д [5, арк. 1–88].

Зусім прыкра, што беларускія гісторыкі яшчэ не асвоілі Дзяржархіў Смаленскай вобласці (поўнае яго назва – АДКУ ДАСВ, што азначае «Абласная дзяржаўная казённая ўстанова “Дзяржаўны архіў Смаленскай вобласці”»). Аўтар некалькі год таму меў магчымасць дзень папрацаваць у гэтым архіве, хаця ўдалося толькі павярхоўна азнаёміцца з фондамі і некаторымі вопісамі, якія па сваёй сутнасці маглі б утрымліваць інфармацыю аб БДУ ў розных праявах яго інстытуцый і асоб. Адразу падалося, што шматлікія справы, у якіх сабраная інфармацыя аб распачынанні стварэння і першых гадах дзейнасці Смаленскага дзяржуніверсітэта, могуць утрымліваць і звесткі аб БДУ. Вядома, што на 1919–1921 гг. абодвы ўніверсітэты канкурыравалі між сабой, так як ва ўладных колах існавалі намеры спыніцца на тым ці другім універсітэцкім праекце з-за абмежаванасці сродкаў і кадраў.

Якраз кадравы голад прымушаў кіраўніцтва ад савецкай адукацыі даваlі лаяльна адносіцца да набору прафесуры. Аб гэтым сведчаць многія прыклады. Вось толькі 1922 год засведчыў замацаванне палітычнай стратэгіі ў галіне вышэйшай школы і навукі пад умоўнай назвай «філасофскі параход». А 1919–1921 гг. прайшлі ў дастаткова ліберальнай плыні, калі ва ўніверсітэты набіралі яўна варожа настроеных да савецкай улады прафесараў (А. Ф. Ізюмаў, Д. П. Канчалоўскі, У. В. Ляпёшкін і інш.). Іх лёсы розныя, але далёка не прапісаныя ў аналах нашай універсітэцкай гісторыі. Нават, калі зноў называць Смаленскі архіў, то для поўнавартаснага

прасапаграфічнага разгляду жыцця і дзейнасці тых жа прафесараў БДУ, вучоных розных накірункаў ведаў (М. М. Нікольскага, У. М. Перцава, А. П. Бястужава, У. М. Дзьякава, Дз. А. Жарынава, П. Л. Панасюка, М. П. Сакалоўскага, М. С. Шыраева і іншых) там маюцца асабістыя справы на ад 3-х да 36 лістоў. У тым ліку і невялічкая справа з дакументамі аб далучэнні У. І. Пічэты з мая 1919 г. па люты 1920 г. да дзейнасці СмалДУ [3, арк. 1–3]. У іншых фондах і вопісах можна знайсці інфармацыю аб працы ў Смаленску будучага рэктара БДУ А. С. Кучынскага, археолага А. М. Ляўданскага, будучага намесніка наркама асветы П. П. Шастакова – «Преданного, выдержанного, энергичного работника», які «безусловно соответствовал занимаемой должности» адказнага работніка губана Смаленскай вобласці [1, арк. 1–2]. Тым большую цікавасць вызываюць пратаколы розных пасяджэнняў універсітэцкага Праўлення, перапіска СмалДУ з рознымі вучэбнымі ўстановамі, спісы студэнтаў і выкладчыкаў і зашмат іншага. Відавочна, што архіў за кошт гэтых матэрыялаў дасць магчымасць удакладніць многія аспекты першых гадоў дзейнасці БДУ. Напрыклад, як развівалася саперніцтва і супрацоўніцтва паміж медфакамі двух універсітэтаў [2, ф. 83].

Дарэчы, калі прадоўжыць тэму медыцынскай адукацыі, то зноў жа узнікаюць зашмат як бы другасных, але важных сюжэтаў аб яе распачынанні і інстытуцыяналізацыі ў БДУ. І тут не абыйсціся без дастаткова ўнікальных архіўных дадзеных. Так, вядома, што медфак адбыўся, дзякуючы не толькі відавочнай запатрабаванасці ў медычных кадрах, але і таму, што ў Мінску дзейнічала з 1867 г. Таварыства ўрачоў. Тым самым меліся і пэўныя кадры для выкладання, і навуковыя здабыткі. У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ўтрымліваюцца дакументы аб працягу дзейнасці Мінскага таварыства ўрачоў у сценах БДУ, аб адзначэнні на медфаку 50 і 60-годдзя яго дзейнасці ў 1922 і 1928 гг. [4, арк. 1–5 зв.]. Гэта дэталі, але з іх і складваецца гісторыя, яны даюць спазнанне агульнага ў розных яго праявах.

Той жа дастаткова засвоены намі прасапаграфічны метад дазваляет праз жыццё і прафесійную дзейнасць асоб адной універсітэцкай карпарацыі прасачыць эвалюцыю самаго БДУ, яго структурных адзінак, вылучыць і асэнсаваць значнасць і знакавасць тагачасных сувязей з дзяржаўнымі органамі Беларусі, грамадскімі арганізацыямі. Калі колькі гадоў таму выпадкова ўзнікла неабходнасць высветліць абставіны працы ў БССР наркама юстыцыі і адначасова пракурора рэспублікі М. А. Сегаля, то аказалася, што ён вельмі цесна быў звязаны з БДУ [19]. А высветліўшы

ягоны лёс і надрукаваўшы некалькі артыкулаў аб гэтым унікальным дзеячы савецкай эпохі, вельмі хутка прыйшлося з іншага боку пераасэнсоўваць напісанае. На пошту прышло пісьмо ад унука аднаго з паплечнікаў наркамюста – Рыгора Іванавіча Нямытых. Да пісьма былі прыкладзены дакументы расійскіх архіваў, фота сярэдзіны 1920-х гг. Яны заставілі яшчэ раз перагледзіць матэрыялы НАРБ, каб адсачыць шлях і гэтага работніка беларускага наркамата, і адначасова па-новаму ўспрыняць ролю ў сістэме юрыспрудэнцыі і юрыдычнай адукацыі прафесара БДУ С. М. Гохмана, выпускніка БДУ і яго выкладчыка Ф. І. Гаузе. Так, Р. І. Нямытых быў назначаны намеснікам наркома юстыцыі (г. зн. Сегаля) і адначасова старшым памочнікамі пракурора БССР (зноў жа Сегаля) [6, арк. 10, 15, 142, 375; 7, арк. 14, 22 зв., 91, 104, 113, 114]. Зварот жа да 205-га фонда архіва дазволіў выявіць тое, што гэты вопытны прававед (у расійскай глыбінцы быў следчым, загадчыкам карацельнага аддзела і інш.) адначасова з’яўляўся студэнтам факультэта права і гаспадаркі БДУ (меў толькі 4 класы гімназіі) [8, арк. 1–5].

Станаўленне і развіццё іншых інстытуцый у растучай структуры БДУ таксама можна прасачыць праз прасапаграфічны падыход. Вядома, што адной з асаблівасцей першых гадоў дзейнасці ўніверсітэта была наяўнасць у яго адукацыйных навацый: выкладанне ішло на чатырох мовах. Адной з іх была польская. Аб асаблівасцях працы гэтай плыні можна ўявіць праз уважлівае прачытанне асабістых спраў яе выкладчыкаў, асабліва дакладна выкладчыкаў польскай мовы, літаратуры і культуры. Сярод іншых найбольшую ўвагу звяртае інфармацыя, якая змешчана ў справах Ядзьвігі Уладзіславаўны Гельтман [10, арк. 1–9], Казіміра Рамуальдавіча Даукшы [11, арк. 1–6], Адама Генрыкавіча Друскоўскага [12, арк. 1–8], Уладзіміра Сямёнавіча Каліноўскага [13, арк. 1–12]. Тут і звесткі аб вытанчанай адукацыі (скончылі альбо Кракаўскі ці Жэнеўскі ўніверсітэты, альбо Ягелонскі ці Санкт-Пецярбургскі), і аб складаным дарэвалюцыйным жыцці, і аб удзеле ў рэвалюцыйных падзеях і інш. А галоўнае тое, што можна прасачыць некаторыя дэталі ўстанаўлення ў Беларусі ўвогуле і БДУ ў прыватнасці польска-арыентаваных плыняў – палітычных, культурных, адукацыйных.

Вышэй было згадана імя гісторыка Дз. А. Жарынава. Аб ім надрукаваны некалькі артыкулаў, ёсць нарыс у юбілейным пяцітомніку «Интеллектуальная элита Беларуси» [17, с. 264–268]. Але зварот да архіваў даў магчымасць высветліць зусім новыя і вельмі важныя абставіны яго працы ў Беларусі, прычыны хуткага ад’езду з Мінску і далейшы лёс, аб якім

мы нічога не змаглі знайсці. Не маглі, пакуль у 2021 г. не сталі рыхтаваць кнігу «Неизвестный В. И. Пичета» на матэрыялах Архіва Расійскай акадэміі навук (АРАН). Ягоная перапіска з Уладзімірам Іванавічам за 1930 – пачатак 1940 гг. у дэталях прадставіла свет універсітэцкіх інтэлектуалаў, паўсядзённасць іх жыцця, узаемаадносінаў, асобныя пертурбацыі ва ўніверсітэцкіх структурах [16, с. 271–295]. Некаторыя новыя акалічнасці адкрыла архіўная справа 205-га фонду НАРБ, да якой раней не ўдалося прычыніцца [15, арк. 1–5]. Так што цяпер можна зноў брацца за належны жыццяпіс гэтага неардынарнага члена першага складу калектыву прафесараў БДУ.

Свайго аўтара-даследчыка чакаюць тэксты аб ролі і месцы ў гісторыі БДУ знакамітатага тэатрала Уладзіслава Галубка, беларускага «Маякоўскага» – Паўлюка Шукайлы [14, арк. 1–5], арганізатара кацэлярскага суправаджэння дзейнасці ўніверсітэта і першага юрыскансультанта БДУ Дз. І. Серко, шматлікіх і такіх розных па сваёй ролі выконваючых абавязкі рэктараў і г. д. Напрыклад, цікавым падаюцца эпізоды жыцця У. Галубка ў рэчышчы першых крокаў БДУ. Так, Праўленне БДУ на пасяджэнні 8 жніўня 1924 г. прыняло рашэнне вызваліць яго ад пасады «скарбніка» па ўласнай заяве, у якой канстатавалася, што гэтая пасада перашкаджае працаваць «в артистической среде». Але ж кіраўніцтва ўніверсітэта прапанавала іншую пасаду і зацвердзіла У. Галубка ў якасці «делопроизводителя общей канцелярии». Па прашэсці меней трох месяцаў (28 кастрычніка 1924 г.) Праўленне было вымушана ўсёж-такі зволіць Голубка [9, арк. 52, 53, 69]. Абставіны ўніверсітэцкага этапу жыцця вядомага дзеяча беларускай культуры, прычыны ягоных перамяшчэнняў на пасадах дастаткова падрабязна зафіксаваны на архіўных старонках і пакуль яшчэ не ўведзены ў біяграфію

Гэты спіс можа быць зашмат працягнуты. Зноў жа хацелася акцэнтаваць увагу на тым, што даследчык можа дабіцца многага ў спазнанні гісторыі, калі знойдзе баланс паміж «асабістай гісторыяй» і гісторыяй палітычных працэсаў, грамадскіх рухаў, розных інстытуцый, тэндэнцый у развіцці культуры і г. д.

### Бібліяграфічны спіс


1. «Абласная дзяржаўная казённая ўстанова “Дзяржаўны архіў Смаленскай вобласці”» (далей – АДКУ ДАСВ). Ф. 19. Воп. 1. Спр. 2873.
2. АДКУ ДАСВ. Ф. 83.
3. АДКУ ДАСВ. Ф. 139. Воп. 4 л. д. Спр. 356.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 502. Воп. 1. Спр. 61; Спр. 62.

5. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. А2306. Воп. 18. Спр. 701.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей – НАРБ). Ф. 6. Воп. 1. Спр. 959.
7. НАРБ. Ф. 15п. Воп. 22. Каробка № 4. Спр. 38.
8. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 5801.
9. НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 80.
10. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 1634.
11. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 2437.
12. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 2640.
13. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 3400.
14. НАРБ. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 9375.
15. НАРБ. Ф. 205. Воп. 4. Спр. 40.
16. Неизвестный В. И. Пичета / сост. М. Ф. Шумейко, В. В. Яновская, О. А. Яновский. Минск: Издат центр БГУ, 2021. 436 с.
17. Петаченко Г. А. Дмитрий Алексеевич Жаринов. Создатель отечественной методики преподавания гуманитарных наук // Интеллектуальная элита Беларуси. Основоположники белорусской науки и высшего образования (1919–1941); под науч. ред. О. А. Яновского. Минск: БГУ, 2017. 303 с.
18. Цэнтральны навуковы архіў НАН Беларусі. Ф. 1. Воп. 1. Спр. 16а.
19. Яновский О. А., Назаренко А. М. М. А. Сегаль: «Дело» наркомюста и прокурора республики в контексте политических процессов 1920–1930-х гг. и становления советского высшего образования // Российские и славянские исследования. 2012. Вып. VII. С. 159–180.
20. Яноўскі А. Распачынанне гісторыі першага ўніверсітэта Беларусі // Беларуская думка, 2021. № 9. С. 75–83.